# Прафклас або каледж?

**Сёлета ў каледжах будзе павялічаны набор выпускнікоў 9-х класаў.**

"Фактычна кожны малады чалавек з ліку выпускнікоў 9 класа зможа паступіць на ўзровень ПТА. Нават калі колькасць бюджэтных месцаў на ўзроўні прафтэхадукацыі будзе меншай за колькасць заявак, то каледжы могуць прыняць рашэнне аб наборы звыш лічбаў прыёму менавіта на ўзровень ПТА. Так, летась на гэты ўзровень мы прынялі на 500 чалавек больш, чым было бюджэтных месцаў. У гэтым годзе разлічваем, што гэтая лічба будзе яшчэ вышэйшай", — сказаў міністр адукацыі А.І.Іванец.

Ён перакананы, што садзейнічаць паступленню ў каледжы 9-класнікаў будзе і тое, што іх па-ранейшаму прымаюць па конкурсе сярэдняга бала дакумента аб адукацыі. Дадатковыя іспыты прадугледжаны толькі на спецыяльнасці фізкультурнага і мастацкага профілю.

"У гэтым годзе мы плануем прыняць у нашы УВА з ліку выпускнікоў каледжа каля 9—9,5 тысячы чалавек. Матываваныя выпускнікі каледжаў будуць мець асобную траекторыю для паступлення на скарочаную форму атрымання вышэйшай адукацыі, пераважна на завочную", — дадаў Андрэй Іванец.

Тым жа, хто вырашыць вучыцца ў 10 класе, міністр раіць звярнуць увагу на профільную падрыхтоўку, напрыклад, на інжынерныя класы, якія былі адкрыты па ўсёй краіне. Галоўным каардынатарам іх работы з'яўляецца БНТУ. Аднак у кожнай вобласці курыруе дзейнасць такіх класаў тэхнічны ўніверсітэт: у Гомельскай — ГДТУ імя П.В.Сухога, Брэсцкай — БрДТУ, Віцебскай — ВДТУ і ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай, Магілёўскай — БРУ, Гродзенскай — ГДУ імя Янкі Купалы, а ў сталічным рэгіёне — акрамя БНТУ, яшчэ БДТУ і БДУІР.

Нягледзячы на тое, што інжынерныя класы функцыянуюць толькі першы год, для іх выпускнікоў Савет Міністраў Беларусі ўжо вызначыў пералік інжынерных спецыяльнасцей (72!), на якія яны могуць быць залічаны без уступных іспытаў.

"Дарэчы, колькасць навучэнцаў у класах прафнакіраванасці становіцца ўсё большай. Так, сёння ў педагагічных вучыцца звыш 8 тысяч школьнікаў 10—11 класаў, а летась іх было толькі каля 7 тысяч. Пры гэтым хацеў бы адзначыць, што і працэнт паступлення абітурыентаў з тых жа педкласаў у апошнія два гады знаходзіцца прыкладна на адным узроўні: кожны трэці выпускнік педкласа паступае на педагагічную спецыяльнасць. З улікам росту колькасці навучэнцаў у такіх класах, мы разумеем, што і абітурыентаў стане яшчэ больш", — падзяліўся меркаваннем А.І.Іванец.

**Вольга АНТОНЕНКАВА.**